**Сямёнава А.І.,** *выкладчык*

# МІМАДРАМА ЯК СРОДАК ВОБРАЗНАГА РАШЭННЯ Ў ПРАГРАМАХ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Галоўнае, што вызначае своеасаблівасць мімадрамы і адрознівае яе ад пантамімы (алегорыі),-- яскравая індывідуальнасць герояў.

Драматургія мімадрамы сутыкае ў канфлікце не чалавека і стыхію (ці чалавека і маску), а чалавека з чалавекам. У аснове сутыкнення ляжыць розная індывідуальная матывіроўка ўчынкаў.

Унутраная індывідуальнасць вядзе кожнага да свайго, непаўторнага знешняга выяўлення, і рэжысёр разам з выканаўцам шукаюць своеасаблівасць пластыкі, мабілізуючы для гэтага ўвесь арсенал магчымасцей пантамімы і дадзенага выканаўцы.

Жыццёвая дакладнасць персанажа вядзе да скарыстання не ўяўнага, а рэальнага, гістарычна дакладнага прадмета, і гэта адно з асноўных патрабаванняў гармоніі мімадрамы. Але пры ўсёй своеасаблівасці мімадрама плоць ад плоці пантамімы і няўмольна прытрымліваецца асноўных яе законаў. А законы гэтыя наступныя.

1. Пантаміма імкнецца да максімальнага абагульнення зместу.

2. Такое абагульненне дасягаецца на аснове рэальнага жыцця праз стылізацыю формы.

3. Шляхі стылізацыі належыць шукаць перш-наперш у найбольшай мэтазгоднасці і дакладнасці кожнага руху.

Разгледзім спецыфіку, якую прыўносіць мімадрама ва ўсе кампаненты будучых праграм. Рэпертуарны арсенал, які выкарыстоўваецца
ў мімадраме, вельмі вялікі (жывапіс, скульптура, музыка, усе жанры літаратуры), але для таго, каб не загразнуць у велізарнай разнастайнасці форм, існуюць пэўныя крытэрыі адбору.

Літаратура з'яўляецца жыватворчай для мімадрамы перш за ўсё тады, калі яскрава выяўлена парадаксальнасць аўтарскай фантазіі, калі дзеянне, апісанае аўтарам, да краю напружана, калі героі апавядання рэльефныя, шматгранныя, маюць непаўторную індывідуальнасць (Чэхаў, Платонаў, Ільф і Пятроў, Шварц, Шукшын, Стругацкія, Салтыкоў-Шчадрын).

Такім чынам, п'еса выбрана. Ёсць напружаны канфлікт, прапрацаваныя характары. У справу ўступае рэжысёр. І зноў усё пачынаецца з таго фундамента, які закладзены, у першую чаргу, школай рэжысуры драматычнага тэатра. Гэта такія якасці, як уменне раскрыць усе канфлікты - і асноўныя і другарадныя, расставіць усе падзеі па ступені іх значнасці і гэтым забяспечыць уласную трактоўку п'есы (нумара), правесці выканаўцу праз увесь комплекс праблем, звязаных са стварэннем суцэльнага і вельмі індывідуальнага свету яго героя.

Але гэтага мала, інакш мімадрама не была б мімадрамай са сваёй адметнай спецыфікай. Неабходна стварыць вобраз сродкамі выразнага жэста. Неабходна знайсці пластычны язык кожнай ролі і ўсяго спектакля ў адпаведнасці з законамі пантамімы і з законамі дадзенай мімадрамы.

Разгледзім механізм стылізацыі жэста.

1. Вобраз нараджаецца ў выніку дзеяння.

2. Дзеянне ў пантаміме ажыццяўляецца праз стылізаваны рух.

Першы этап стылізацыі - гэта стылізацыя праз дакладнасць, праз максімальную лаканічнасць і прадуктыўнасць кожнага руху. Другі этап - стылізацыя ад вобраза, паколькі ўсе крытэрыі - «дакладна» ці «недакладна», «прадуктыўна» ці «непрадуктыўна» - вызначаюцца логікай дадзенага персанажа.

Асновай лёгка чытаемага руху з'яўляюцца імпульс, які пачынаецца ад вызначанага пункту і ў вызначаным пункце заканчваецца, і хваля, якая пачаты рух пашырае ў пэўным напрамку і ў пэўным характары. Імпульс, хваля маюць дакладны напрамак (уперад ці назад), вызначаную сілу (яны больш ці менш энергічныя). Хваля па характару можа быць маруднай ці хуткай, можа затухаць ці набіраць моцы.

Месца пачатку руху (пункт прыкладвання імпульсу) непасрэдна залежыць ад мэты дзеяння (жэст «дай» і жэст «вазьмі» пачнуцца з розных пунктаў) і характару дзеяння («вазьмі ад сэрца» і «вазьмі ад грэблівай пагарды» таксама пачнуцца па-рознаму).

Мэта і характар дзеяння заўсёды звязаны з яго логікай і, такім чынам, дадзены імпульс і дадзеная хваля ў дадзеных абставінах заўсёды служаць выяўленню індывідуальнасці выканаўцы, таму што ў кожным з нас ёсць галоўныя імпульсы і галоўныя хвалі, і іх своеасаблівасць стварае пластычную непаўторнасць асобы.

Наша задача - навучыць студэнтаў пільна заўважаць гэтыя галоўныя імпульсы і хвалі, аддзяляць іх ад другарадных і ўмацоўваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ